УДК 882.6–1

*Т. І. Борбат*

# ЭТЫЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ІСНАВАННЯ ЧАЛАВЕКА Ў ПРОЗЕ С. ГРАХОЎСКАГА
## (на матэрыяле аўтабіяграфічнай аповесці «Зона маўчання»)

У канцы 80-х гг. мінулага стагоддзя ў сувязі з ідэямі «перабудовы», «новай свядомасці» пачалі друкавацца творы на так званую лагерную тэму, якая да гэтага часу была прадстаўлена аповесцямі Ф. Аляхновіча «У кіпцюрох ГПУ»[1] і «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» А. Салжаніцына. На старонках літаратурна-мастацкіх часопісаў змешчаны творы Я. Бяганскай, А. Звонака, П. Пруднікава, Б. Мікуліча, С. Шушкевіча, А. Кавалёва, С. Грахоўскага.

С. І. Грахоўскі — пісьменнік складанага і цікавага лёсу. Дзевятнаццаць гадоў правёў мастак у няволі. Аднак ён змог выстаяць, выжыць і падняцца з пекла. Хоць паняцце «пекла» ў яго рэлігійным значэнні трактуецца некалькі інакш: у пекле пакутуюць грэшнікі. Савецкі ж лагер — гэта асобны свет, дзе поўнасцю адсутнічае мараль, дзе перамагае зло, дзе пакутуюць у большасці сваёй людзі бязвінныя. С. Грахоўскі, захаваўшы сябе як асобу, як мастака, адкрыў чытачу жудасную праўду пра Калыму.

У 1990 г. пісьменнік выдаў кнігу «Споведзь», за якую атрымаў Дзяржаўную літаратурную прэмію імя Якуба Коласа. Аснову «Споведзі» складаюць празаічныя творы — дзве аўтабіяграфічныя аповесці «Зона маўчання», «Такія сінія снягі», да іх далучаецца аповесць «З воўчым білетам».

---

[1] Аднак аповесць не зрабіла ўплыву на літаратурны працэс 50—80-х гг., бо шырокаму колу чытачоў стала вядома толькі ў 1991 г., праз 50 год пасля публікацыі яе ў акупацыйнай «Менскай газэце» (1941—1942).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На жаль, у сучасным літаратуразнаўстве няшмат прац, у якіх разглядаецца аўтабіяграфічная проза С. Грахоўскага, у тым ліку і аповесць «Зона маўчання». Нямала цікавых заўваг наконт аповесці выказвалі А. Рагуля [1], Л. Гарэлік [2], Л. Ламека [3]. Мэта нашай работы — разгледзіць этычную канцэпцыю існавання чалавека, што выявілася ў аповесці С. Грахоўскага «Зона маўчання», як выражэнне асноўнай праблематыкі яго творчасці. У такім літаратуразнаўчым аспекце аповесць не разглядалася.

Спрэчкі аб тым, у чым моц і слабасць чалавека, чым вызначаюцца параметры яго маральных граніц, у літаратуры вядуцца даўно. У гэтай сувязі нагадваецца творчасць Ф. М. Дастаеўскага, у прыватнасці яго «Запіскі з мёртвага дому». У творы, зразумела, не даецца ўся праўда пра катаргу, але гэтага і нельга чакаць ад асобнага мастацкага твора. Безумоўны маральны пафас кнігі: «Нельга нікога адвяргаць канчаткова і беспаваротна, бо нават самыя паўшыя не якія-небудзь злачынныя істоты, а такія ж твары Божыя, як і ўсе астатнія» [4, с. 14]. Не забудзем, што ў мастацкай прасторы рамана Дастаеўскага сабраны сапраўдныя злачынцы. Але і яны, на думку аўтара, заслугоўваюць спачування.

Класічная літаратура паслядоўна праводзіла думку аб тым, што нават у самых жудасных умовах чалавек павінен застацца чалавекам. Менавіта ўпершыню ў прозе С. Грахоўскага маральны аспект высвечаны па-іншаму. Пісьменнік паказаў і тое, як небяспечна дапусціць разбурэнне асобы, «калі чалавек станавіўся рабом страўніка, траціў годнасць і сорам, пачынаў лазіць па памыйніцах і сметніках, вылізваць у сталоўцы чужыя міскі, рабіўся шакалам» («Туфта» [5, с. 24]).

Як вядома, пытанне аб уздзеянні лагера на духоўны свет чалавека стала прычынай разыходжання А. Салжаніцына з В. Шаламавым. У творы «Архіпелаг ГУЛАГ» А. Салжаніцын дакладна перадае пазіцыю В. Шаламава: «У лагернай сітуацыі людзі ніколі не застануцца людзьмі... Усе чалавечыя пачуцці — каханне, сяброўства, зайздрасць, чалавекалюбства, міласэрнасць, жаданне славы пакінулі нас разам з мясам мускулаў» [6, с. 386]. На думку аўтара «Калымскіх апавяданняў», у лагеры чалавека чакае толькі разбэшчванне: «Лагер разбурае любую душу — начальніка і падначаленага, вольнанаёмнага і зняволенага, кадравага камандзіра і нанятага слесара» [7, с. 70]. Пазіцыя А. Салжаніцына іншая: «Як у прыродзе не адбываецца працэсу акіслення без аднаўлення, так і ў лагеры (і наогул у жыцці) не адбываецца разбэшчвання асобы без яе ўзыходжання. Яны побач» [8, с. 391].

На наш погляд, пазіцыя С. Грахоўскага набліжаецца да пазіцыі А. Салжаніцына, які сцвярджае, што ў лагеры чалавек усведамляе сваю правату, сваю невінаватасць (бо большасць зняволе-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных — не злачынцы), гэта дазваляе яму адчуваць сябе ўнутрана незалежным. Імкнучыся захаваць сабе жыццё, чалавек паўстае перад выбарам — ці трэба выжыць «любой цаной» (гэта значыць за кошт іншых), ці застацца верным сваім маральным прынцыпам. Гэты крытычны момант адкрывае перад арыштантам два шляхі — шлях узыходжання і шлях разбэшчвання, які ператварае чалавека ў злодзея, людаеда.

У аповесці «Зона маўчання» С. Грахоўскі, услед за А. Салжаніцыным, паказвае гэтыя два працэсы. Прытым, калі А. Салжаніцын адзначае, што ў лагеры разбэшчваліся тыя, хто ў мірным жыцці не вызначаўся ніякімі маральна-этычнымі якасцямі [6, с. 39], то С. Грахоўскі падкрэслівае, што сістэма не шкадавала нікога.

Аповесць «Зона маўчання» — самая жудасная з лагернага цыкла. Яна складаецца з невялікіх самастойных апавяданняў, якія ствараюць буйнамаштабны твор, своеасаблівую «лагерную энцыклапедыю». Пісьменнік добра паказвае, як адбываўся прадуманы працэс знішчэння чалавека. Першым падступаў голад. Холад, пабоі, непасільная паднявольная праца, хранічнае недаяданне, «стукацтва» прытуплялі ў падняволеных усе пачуцці і жаданні: «Нават самы дужы і здатны лесаруб праз паўгода трапляе ў “слабасілку”, аціраецца каля кухні, на сметніках збірае косці, становіцца “шакалам”, “міскалізам”, апухае, перастае ўмывацца і непрыкметна пераходзіць у групу “Д”» («Туфта»[5, с. 21]).

Аднак разбэшчвалі не толькі жудасныя ўмовы існавання і крымінальнікі. «Каты з неабмежаванаю ўладаю» подпісы пад пратаколамі вырывалі здзекамі, інсцыніраванымі расстрэламі, пагрозамі знішчыць усю сям'ю і ўсю радню («Чаму? За што? Навошта?» [5, с. 44]). Перад «д'ябальскаю машынаю фальсіфікацый, падробак, фізічных і маральных здзекаў» ламаліся загартаваныя старыя бальшавікі, што «прайшлі допыты царскіх жандараў, катаржныя цэнтралы, зведалі першыя этапы» («Чаму? За што? Навошта?» [5, с.44]).

С. Грахоўскі добра перадае дух, атмасферу часу, тыповыя абставіны і чалавечыя характары, воблік савецкага чалавека, у тым ліку і следчага — супрацоўніка НКУС. Гэты вобраз прынцыпова адрозніваецца ад таго, які на працягу доўгіх гадоў навязваўся савецкай літаратуры.

Самыя жудасныя вынікі сталінскага ГУЛАГа — знішчэнне асобы чалавека, вынішчэнне маральна-духоўнага пачатку. Смерць стала звычайнай з'явай, а гэта, зразумела, змяніла ўсе маральныя каардынаты. Адбываецца перараджэнне чалавека. «У шалмане я назіраў мноства зламаных лёсаў, маральнае падзенне, жорсткасць і сентыментальнасць у адной асобе. Я бачыў, як дзялілі і хавалі крадзенае, як прагульвалі ў “бурду” і “штос” чужыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

шмоткі, маглі прагуляць чалавека і забіць першага, хто пройдзе за акном» («У шалмане» [5, с. 66]).

Розныя «маралі» блатных, «шасцёрак», днявальных, брыгадзіраў, самарубаў, вартавых і канвойных служаць адной жыццёвай мэце: выжыць. «Яшчэ неяк трымаўся той, хто засвоіў спрадвечныя лагерныя ісціны: "Не правялі б канала без туфты і аманала", "Дзень кантоўкі — месяц жыцця". Астатняе залежыла ад вынаходлівасці, асцярожнасці і рызыкі, каб не засыпацца, не трапіць у кандзей і здаваць адны і тыя ж дровы, рудстойку і дзелавы лес, пакуль не вывезуць з дзялянкі» («Туфта» [5, с. 21]).

Агульная маральная «пераарыентацыя» назіраецца ў апавяданні «Смерць ангела», калі брыгадзір не надта спяшаўся даваць на нябожчыка звесткі ў санчасць, каб яшчэ дні два мець лішнюю пайку на брыгаду [5, с. 84]. Нікому не адмаўляла ў сваіх пяшчотах за пайку хлеба або скварку, украдзеную з торбы рабацягі, «маленькая касавокенькая цыганачка», што вечарамі прыбягала ў шалман («У шалмане» [5, с. 67]).

Першымі апускаліся ў лагеры не загартаваныя працай інтэлігенты. Яны хадзілі па сметніках каля кухні, вылізвалі чужыя міскі, «станавіліся абыякавыя, пераставалі ўмывацца, трацілі чалавечае аблічча і годнасць, ад жывых ішоў нейкі трупны дух» [5, с. 83]. Так пайшла збіраць у «сталовай пустыя міскі і выскрабаць з іх падонкі брудным пальцам» выдатная спявачка Варламава, якую ўпарта шукаў Галівуд для ўдзелу ў фільме («Дарэмныя пошукі Галівуда» [5, с. 109]).

Здрадніцтва, даносы, маральнае падзенне — гэта не толькі прэрагатыва аднаго лагера. «Логіка расчалавечвання даведзена да свайго вышэйшага абсурду, які не заўсёды прадбачылі класікі — да людаедства. Яно сустракалася па абодва бакі лагернага дроту», — заўважае А. Рагуля [5, с. 4]. Марыя Дарожка ў час голаду на Украіне ў стане галоднага псіхозу засекла і з'ела сваё дзіця. Пісьменнік разважае: хто давёў жанчыну да такога падзення? А ў гэты час дзяржава «прадала ў той неўрадлівы год за мяжу 12 мільёнаў цэнтнераў збожжа» [1, с. 4].

У аповесці «Зона маўчання» С. Грахоўскі паказвае ўзаемадзеянне злачыннага свету і Сістэмы. Законы і мараль Сістэмы былі падобны на зладзейскія: культ сілы, татальнае сачэнне, стукацтва, самадурства. Так, былы рэцыдывіст-крымінальнік Іван Самойлаў стаў выканаўцам бязлітаснай волі начальства («Жыццё-капейка» [5, с. 94]). Добра ўладкаваўся ў лагеры і аўтарытэтны крымінальнік Іван Вадап'янаў. Афіцыйна ён лічыўся днявальным, «хоць ні разу не трымаў у белых дагледжаных руках з доўгім кіпцем на мязенцы ні дзеркача, ні дужкі ад вядра. Усё за яго рабілі "шасцёркі" — служкі па няволі...» («Нявольнікі-артысты» [5, с. 69]). Патурала начальства ва ўсім і К. Зотаву, колішняму буйному махляру («Смерць ангела» [5, с. 82]).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

С. Грахоўскі падкрэслівае: у свеце блатных фізічнае ўздзеянне становіцца ўздзеяннем маральным. Гэты ж прынцып узяла на ўзбраенне і дзяржава («Чаму? За што? Навошта?», «Першамайцы»).

«Парад праўд» (В. Шаламаў), з якімі сутыкнуўся пісьменнік на Калыме, не вычэрпваецца паказам жыццёвых арыенціраў розных крымінальнікаў, дахадзяг, начальства ўсіх рангаў. Былі і тыя, каму цудам удалося не здрадзіць сваім жыццёвым прынцыпам, «узняцца над подласцю, варварствам, не страціць свой чалавечы воблік, не спаганіць душу, не запляміць сумленне» [3, с. 249]. Так, С. І. Эндэн, «увасабленне чысціні, жаноцкасці і прыгажосці» пайшла на лесапавал, але не стала палюбоўніцай Фамічова («Глухата»). Вучоны Федчанка выбірае смерць, чым нявольнае жыццё («Непаўналеткі»).

Трапіў у лагер за нейкае парушэнне і Цокур — былы настаўнік пачатковай школы, добры, сумленны чалавек. Многія зняволеныя ласкава называлі яго «бацем». Ён перажываў за кожную смерць, кожнае калецтва і рабіў усё, каб хоць неяк палегчыць жыццё падняволеных у лагеры.

Пісьменнік заўважае, што звычайна лёс такіх людзей, як Цокур, складваўся трагічна. Сцяпан Гаўрылавіч спіўся і дачасна памёр. Такі канец спасціг і былога начальніка КВЧ Веню Камракова, «яго замучылі кашмары, бяссонне і галюцынацыі, ён запіў...» («Этап з таго свету» [5, с. 147]). Так канчалі сумленныя людзі.

У аповесці «Зона маўчання» С. Грахоўскі стварае панараму лагернага жыцця і розных жыццёвых прынцыпаў, ацэнку якім пісьменнік у большасці выпадкаў не дае. Ён канстатуе. Права аналізаваць аўтар прадастаўляе чытачу. Толькі адзін маральны вывад, які пацвярджае ранейшыя арыенціры С. Грахоўскага, гучыць у аповесці: «У самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з безнадзейнасці і збавення» [5, с. 4]. С. Грахоўскі заўсёды падкрэсліваў сваё непрыманне законаў і асноў гулагаўскага свету.

Пісьменнік увесь час вырашае пытанне аб суадносінах фізіялагічнага, цялеснага і духоўнага, біялагічнага і сацыяльнага. Лагер ператварае чалавека проста ў цела, але часам перамагае душа. Толькі гэта бывае рэдка.

Мастак паказаў працэс расчалавечвання, калі чалавека, акрамя ўсяго, пазбаўлялі задавальнення чыста фізіялагічных патрабаванняў. Людзі змагаюцца за жыццё, падвяргаючы яго часам смяротнай небяспецы. Каб толькі не хадзіць на работу, вырвацца ў стацыянар, «адны зашывалі сабе рот, прышывалі гузікі на голыя грудзі, рэзалі чэрава, калечылі рукі» («Брыгада “Ух”»

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[5, с. 78]), «прыкладалі да цела пялёсткі люцікаў, а праз пару дзён з'яўлялася мокрая флегмона, набівалі тэмпературу, на вогнішчы прыпальвалі пятку» [5, с. 81].

Зайздрасць і жаданне адпомсціць штурхаюць Петухова да забойства Федзі Белянова, які пасля таго, як стаў інвалідам, працаваў у сталоўцы і ганяў такіх «шакалаў», як Петухоў, каб не кралі пайкі і прэмблюды («Федзя Беляноў» [5, с. 142—143]). Так, пад уздзеяннем жыцця ў лагеры трансфармаваліся ўяўленні Петухова аб жыццёвых каштоўнасцях, межах маралі.

Такім чынам, не толькі калымскія забоі, лесапавалы, але і маральныя асновы лагера мянялі псіхіку падняволеных людзей. Санчасць, сталоўка — практычна адзіная для падняволеных магчымасць выжыць — таксама падточвалі мараль чалавека. Шчасцем абарочваліся абрубленая далонь, загніўшая рана. Загнівалі не толькі раны людзей, загнівалі душы некаторых урачоў, санітараў, начальнікаў: нахабна дамагаўся С. І. Эндэн Фамічоў, абяцаючы ёй палепшыць умовы жыцця, перавесці на іншую работу («Глухата»), увесь лагер ведаў жорсткасць і мянушку «Воўк» Івана Самойлава — старшага дзяжурнага на лагпункце («Жыццё-капейка»). С. Грахоўскі заўсёды падкрэслівау думку, што «дахадзязе» можна даравацъ многае. Жорсткасць і амаральнасць Сістэмы і яе прыслужнікаў ні зразумець, ні дараваць нельга.

Пытанне аб тым, ці можа чалавек захаваць сваё сумленне ў бесчалавечных умовах, думаецца, не можа мець універсальнага адказу. Але варта поўнасцю пагадзіцца з думкай, што «ГУЛАГ не здолеў знішчыць Веру людскую, Дабро і Спагаду. Яны прарываліся праз абсурдную рэчаіснасць і «ў тым жахлівым пекле набывалі зусім канкрэтны змест: праз апошні сухар, ахвяраваны сябру, рэшткі адзежыны, накінутыя на плечы дахадзягі, праз ласкавы дотык чыесьці рукі, усмешку, слова» [3, с. 249].

Дабрыня і надзея, прыгажосць і мастацтва — вось тое галоўнае, у што верыў С. Грахоўскі, што выратавала яго ў гулагаўскім пекле.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Рагуля А.* Са шляхоў крывава-дымных // ЛіМ. 1990. 14 вер.
2. *Гарэлік Л.* Пропаведзь дабра // Полымя. 1994. № 2.
3. *Ламека Л.* Асвечанае трагедыяй // Полымя. 1991. № 3.
4. *Василевский А.* Особые заметки о погибшем народе // Детская литература. 1991. № 8.
5. *Грахоўскі С. І.* Выбраныя творы: У 2 т. Т 2. Крыжавы шлях: Аповесці. Апавяданні. Мн., 1994.
6. *Солженицин А. И.* Архипелаг ГУЛАГ: У 2 т. М., 1989. Т. 2.
7. *Шаламов В. Т.* Новая проза // Новый мир. 1989. № 12.
8. *Савік Л.* Святых пакутнікаў імёны // Звязда. 1992. 18 жн.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## SUMMARY

*In this article the author intends to formulate an epic conception of man's existence, which has been revealed in autobiographical story. An Silence Area by S. Grahovsky. He wants to show the conditions of the camp influence in the person's inner world.*


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Куле